**Г.В. Навасельцава**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: Novoseltseva.anna@mail.ru

УДК 821.161.3-31

# АКСІЯСФЕРА РАМАНАЎ В. КАРАМАЗАВА І В. КАЗЬКО

*Ключавыя словы: аскіясфера, раман, герой, нацыянальны характар, каштоўнасць, Віктар Карамазаў, Віктар Казько.*

*У артыкуле на прыкладзе раманаў «Пушча» В. Карамазава, «Неруш», «Хроніка дзетдомаўскага саду» В. Казько разглядаецца мастацкае асэнсаванне пераемнасці мінулага, сучаснага і будучага, беражлівага стаўлення да прыроды і гуманістычнага стаўлення да чалавека. Пісьменнікі сцвярджаюць значнасць засваення асобай родавай спадчыны, далучанасці да спадчыны беларусаў, маральнае аблічча асобы падаецца вынікам дэтэрмінацыі духоўнага вопыту мінулых пакаленняў.*

Айчыннымі раманістамі маральны выбар асобы асэнсоўваецца праз распрацоўку экалагічнай тэматыкі ў аксіялагічным ракурсе. Пісьменнікамі ў працэс пераемнасці мінулага, сучаснага і будучага ўключаецца прыродны свет, даследуецца яго ўплыў на фарміраванне рыс нацыянальнага характару (міласэрнасць, дабрыня, спагадлівасць). У творах «Пушча» (1979) В. Карамазава, «Неруш» (1981), «Хроніка дзетдомаўскага саду» (1986) В. Казько арганізацыя вобразнай сістэмы заснавана на прынцыпе антытэзы; асоба рэпрэзентуецца арганічнай часткай прыроднага асяроддзя і, адначасова, неад’емнай ад роду і сям’і, а яе маральнае аблічча падаецца вынікам дэтэрмінацыі духоўнага вопыту мінулых пакаленняў. Здольнасць беражліва адносіцца да прыроды, паважліва ставіцца да іншых людзей пісьменнікі звязваюць з узроўнем засваення чалавекам здабыткаў родавай і нацыянальнай спадчыны. У раманнай сітуацыі заяўлены героі-антаганісты, адзін з якіх увасабляе найлепшыя духоўныя якасці, другі выступае амаль поўным антыподам, і кожны з герояў раскрываецца ў сваім мікраасяроддзі. Пры гэтым найбольшай ідэйна-мастацкай вагой надзелены персанажы, якія рухаюцца паміж вызначанымі «палюсамі» і маюць мажлівасць усвядомленага выбару сваёй жыццёвай пазіцыі. Ідэйнымі апанентамі ў рамане «Пушча» выступаюць некалькі ідэалізаваны Міхаль Валошка і паказаны этычна зніжана Васіль Зімавец. У «полі прыцягнення» абодвух герояў знаходзіцца малады чалавек Андрэй, які ўрэшце прымае жыццёвы досвед Валошкі. У рамане «Неруш» супрацьпастаўлены дзед Дзям’ян, які выхоўваў Мацвея Роўду, і Шахрай, які прэтэндуе на ролю настаўніка Мацвея. Канфлікт у душы Мацвея Роўды абумоўлены ўплывам «полюсных» вобразаў, і гэта спараджае дзеянні, якія прыводзяць да экалагічнай трагедыі ў родных мясцінах Роўды. У рамане «Хроніка

дзетдомаўскага саду» герой, які выступае суб'ектам апавядання, асэнсоўвае жыццёвы шлях персанажаў-антаганістаў Мар'яна Знаўца і Сідара Місцюка, учынкі якіх раскрываюць прыярытэты асобы ў духоўным і матэрыяльным вымярэннях, розныя іпастасі нацыянальнага характару.

Раман у беларускім прыгожым пісьменстве 1980-х гадоў вызначаецца ўскладненнем тэматыкі і праблематыкі, што абумоўлена ў тым ліку пазалітаратурнымі фактарамі. Развіццё навукі і тэхнікі, дзяржаўная палітыка, скіраваная на здабычу прыродных рэсурсаў, спробы пераструарэння прыроднага асяроддзя (напрыклад, меліярацыя) актуалізавалі экалагічную тэму ў літаратуры. Экалагічная праблематыка становіцца значнай у рускай савецкай прозе 1970-х гадоў, што доказваюць творы В. Распуціна, В. Астаф'ева, кіргізскага пісьменніка Ч. Айтматава. Віктар Карамазаў і Віктар Казько звяртаюцца да мастацкага асэнсавання надзвычай актуальнай экалагічнай тэмы, што ўключаецца ў складаны аксіялагічны кантэкст. В. Карамазаў на канцэптуальным узроўні супастаўляе беражлівае стаўленне і прагматычнае карыстанне ў рамане «Пушча», які А. С. Яскевіч слушна называе ўнікальным творам пра беларускі лес. Раман «Пушча» вызначаецца арганічным спалучэннем эпічнай шматгеройнасці і лірычнага «шматгалосся», аўтар не столькі апісвае дзеянне, колькі раскрывае ўнутраны свет персанажа, іншасказальнасць заглыбляе філасофскі змест твора. Даследчык, параўноўваючы раман беларускага аўтара са знакамітым «Рускім лесам» Л. Ляонава, доказна даводзіць, што Віктар Карамазаў не толькі стварыў арыгінальныя нацыянальныя вобразы, але і адгукнуўся на грамадскія запатрабаванні часу, калі ўзнікла неабходнасць «выпрацоўкі экалагічнай філасофіі, урэшце, стварэння новай этыкі ўзаемаадносін чалавека з прыродай» [4, с. 579].

Мастацкая распрацоўка такога роду этыкі прадугледжвала стварэнне вобразаў з высокай аксіялагічнай значнасцю, пададзеных, як правіла, іншасказальна. В. Карамазавым створаны адметны вобраз алянухі Пані, мацёрага і мацёрай, якія ўваходзяць у сістэму персанажаў рамана як паўнавартасныя героі, надзеленыя індывідуальнымі рысамі. Сімвалічная вобразнасць дамінуе ў фінале рамана: у самы небяспечны момант нябога Мураўка б'е ў звон, кліча людзей, як на пажар, ратаваць ад згубы старыя дубы. Да гэтага закліку на ўзроўні шырокага абагульнення далучаецца і голас аўтара, у якім чуецца трывога за ўсё жывое на зямлі. Дадзеная галоўным героям маральна-этычная ацэнка ўгрунтоўваецца на іх адносінах да прыроднага асяроддзя. Беражлівым стаўленнем да прыроды і людзей вызначаюцца паводзіны ляснічага Валошкі, сумленнага і мудрага чалавека. Лясное багацце бачыцца самім героем не столькі матэрыяльнай каштоўнасцю, колькі духоўнай.

У так званае «поле прыцягнення» Міхаля Валошкі ўваходзяць персанажы, якіх можна назваць блізкімі лепшым пташнікаўскім героям.

Каларытны вобраз дзеда Гароха, які ўвасабляе такія рысы нацыянальнага характару беларуса, як працавітасць, зычлівасць, вернасць малой радзіме, і разам з тым выступае сімвалічна шматзначным. Дзед Гарох, нечым падобны да Андрэя Вялічкі, выступае жывым увасабленнем памяці, якой не хапае маладому пакаленню, каб пераняць духоўную традыцыю продкаў, а разам з ёю – беражлівае стаўленне да ўсяго жывога. Па даўняй традыцыі, калі паміраў нехта з пушчанцаў і не мог дачакацца святара, то спавядаўся Святому дубу, пра што нагадвае і стары Кулаш, які выступае непрадузятым назіральнікам, надзелены найвышэйшым маральным аўтарытэтам. Знішчаць старадаўнія дубы – гэта маральнае злачынства! – гучыць прысуд Кулаша найперш Зімаўцу, які спакусіўся добрым заробкам і не ведае, што пад Святым дубам сканала яго прабабка. Праблемна-тэматычны дыяпазон рамана ўзбагачаецца дзякуючы творчай распрацоўцы аксіялагічных аспектаў узаемаадносін «асоба – прырода – род – спадчына». Як доказна даводзіць аўтар, той, хто не ведае гісторыі свайго роду, гатовы лёгка нішчыць лясы, якія не толькі з’яўляюцца памяткамі мінулага, але і своеасабліва ўмацоўваюць сувязь паміж пакаленнямі.

Першы раман В. Казько «Неруш» прыўносіць у беларускую буйную прозу трывогу за будучыню, прадбачанне катастроф. Вызначаныя пісьменнікам аксіялагічныя параметры жыцця беларусаў становяцца асновай для мастацкай прагностыкі. П. В. Васючэнка слушна падкрэслівае, што «ў асобных, надзвычай драматычных эпізодах твора праглядаюцца апакаліптычныя матывы, што дае падставу сцвярджаць пра новую з’яву ў беларускай раманістыцы – набліжэнне да жанру рамана-антыўтопіі, надзеленага футуралагічнай, папераджальнай і прагнастычнай функцыямі» [1, с. 742]. Твор вылучаецца іншасказальнасцю, раманнае дзеянне драматызуецца, вобразы герояў набываюць сімвалічныя рысы. Пісьменнік малюе Палессе, яго непаўторную прыроду, знітаванага з прыродай чалавека – палешука, які заўсёды вызначаўся сваім характарам. Мастацкае асэнсаванне экалагічнай этыкі і анталогіі беларускага побыту фарміруе значны аксіялагічны дыяпазон рамана, які ўключае не толькі міжасобасныя адносіны, але і адносіны чалавека з прыродным светам. Пісьменнік акцэнтуе сваю ўвагу на вобразе Мацвея Роўды, прасочвае яго ўзаемадзеянне з іншымі героямі. Мацвей адчувае маральны ўплыў свайго дзеда Дзям’яна, палешука, мудрага і спагадлівага чалавека. Дзед Дзям’ян выхоўваў унука, які рана застаўся без бацькоў, перадаў яму чуйнае стаўленне да акаляючага свету. Пры тым Мацвей перакананы, што павінен палепшыць жыццё аднавяскоўцаў, што немажліва зрабіць без тэхнічных пераўтварэнняў, у ліку якіх – меліярацыйная работа. Гэтаму вучыць старэйшы таварыш і ў нейкай меры жыццёвы настаўнік Роўды – Шахрай, які зневажальна адносіцца да прыроднага асяроддзя, ставіцца да зямлі найперш як да крыніцы матэрыяльнага ўзбагачэння.

Высокай каштоўнасцю ў рамане надзяляецца духоўная повязь, знітаванасць чалавека і прыроды. Так, Мацвей Роўда, які бачыць чараду буслоў або, як іх называюць на Палессі, антонаў-лелькаў, атаясамлівае іх са сваімі аднавяскоўцамі, сваёй сям'ёй. Буслы ў апошні год выгадавалі толькі па адным бусляняці, паколькі людзьмі быў знішчаны іх адвечны дом – балоты. Асушэнне балот у ваколіцах вёскі Княжбор мае трагічныя наступствы, якія не адразу ўсведамляюцца героямі твора. Раман «Неруш» адлюстроўвае тагачаснае вясковае грамадства і «ўтапічную» прастору са спыненым часам, што рэпрэзентуецца міфалагічнымі вобразамі Галоскі-галасніцы, Жалезнага Чалавека, перакуленым светам, які прыходзіць да Мацвея ў снах. Як слушна падкрэслівае П. В. Васючэнка, «існаванне гэтых вобразаў падаецца амаль як рэальнае, прынамсі, аўтар рупіўся пра плаўны, амаль нябачны пераход апавядальнай плыні ад прыземленай бытапісальнасці да фантасмагорыі і міфалагізму. Міфалогія Палесся складае частку раманнага хранатопу, дапаўняе тую "неруш", якая складае пракавечныя асновы быцця рэгіёну» [1, с. 740]. Так, знішчаныя княжборцамі дубы растуць у перакуленым свеце, акно ў які ўяўляецца дрыгвяністай Чортавай прорвай. Як папярэджанне пра трагічныя наступствы, з'яўляецца ў начным Княжборы Жалезны Чалавек, што палохае палешукоў, увасабляе памяць і сумленне.

В. Казько невыпадкова называе Жалезнага Чалавека двайнікам Мацвея: паляшук Роўда павінен быў стаць захавальнікам Палесся, але ненаўмысна распачаў знішчэнне – злачынства супраць прыроды і людзей. Няўмелая меліярацыя прыводзіць да таго, што асушаныя тарфянікі пагражаюць пажарамі, новая ўрадлівая глеба хутка вынішчаецца эрозіяй, а вёску Княжбор захлынае паводка. Сімвалічны малюнак у фінале рамана – паказана пылавая бура, незнаёмая раней з'ява для аднавяскоўцаў Мацвея, якая ўвасабляе маральны прысуд галоўнаму герою за тое, што быў лес, была вада, а стала пекла. Адчуваючы сваю віну, Роўда ратуе бусла, з якім іншасказальна параўноўваецца і сам герой: бусел выгнаны з чарады за тое, што быў нядужым, Мацвея аднавяскоўцы праклінаюць за тое, што не змог зберагчы сваю зямлю. Міфалагічная і сімвалічная іншасказальнасць узмацняюць ацэначны паказ разбуральнай дзейнасці, у выніку якой да непазнавальнасці змяняецца малая радзіма галоўнага героя. Пакаранне за гэту дзейнасць асэнсоўваецца пісьменнікам ў філасофскім рэчышчы, па-мастацку распрацоўваецца як этычная катэгорыя з аксіялагічным зместам. Такім чынам узаемаадносіны асобы з прыродным светам выступаюць найбольш значнымі, фарміруюць цэнтральную аксіясферу рамана, міжасобасныя стасункі – сэнсава значнай перыферыяй аксіясферы.

У творы В. Казько «Хроніка дзетдомаўскага саду» П. В. Васючэнка слушна бачыць набліжэнне да жанравай разнавіднасці філасофскага рамана. Пісьменнік, які адлюстроўвае асобу ў кантэксце гісторыі, «вольна распараджаецца мастацкім хранатопам, сумяшчае розныя часавыя

пласты, эксперыментуе з пpасторавымі асацыяцыямі» [1, с. 743]. У рамане вылучаецца асэнсаванне гістарычнай пераемнасці пакаленняў, прыроднага свету як чалавечага дому, асоба разглядаецца ўключанай у родавую повязь, выступае носьбітам духоўнай спадчыны, што спрадвеку знітоўвала вясковую грамаду. В. Казько канцэптуальна ўзнаўляе нацыянальную рэчаіснасць, на што справядліва звярталі ўвагу даследчыкі: калі ў рамане «Неруш» па-майстэрску паказана рэальная трагедыя – руйнаванне нацыянальнай светабудовы, то ў «Хроніцы дзетдомаўскага саду» выяўлена канцэпцыя адраджэння нацыянальнай самасвядомасці [2], відавочна ўгрунтаваная на мастацкім абагульненні аксіялагічнага вопыту беларусаў.

У «Хроніцы дзетдомаўскага саду» пісьменнік вымярае жыццёвы вопыт як у маральна-этычных каардынатах духоўнага пошуку, так і матэрыяльнага ўзбагачэння. Духоўны і матэрыяльны пачаткі ўвасабляюць героі-антаганісты, Мар’ян Знавец і Сідар Місцюк, якія прадстаўляюць два «палюсы прыцягнення», пад уздзеяннем якіх іншыя героі мусяць рабіць свой выбар. На ідэйна-мастацкім узроўні заяўлены шматзначны вобраз саду, які «можа атаясамлівацца з індывідуальным выбарам, воляй распараджацца ўласным лёсам» [1, с. 745]. Думаецца, вобраз саду варта разглядаць не толькі ў кантэксце індывідуальнага лёсу Мар’яна Знаўца і Сідара Місцюка, але і адметнага шляху грамадскага развіцця беларусаў, што ілюструе пераемнасць мінулага і сучаснага. Сад выступае ўвасабленнем светлых спадзяванняў не адных гадаванцаў дзіцячага дома. Спачатку яго садзіць пагранічнік Трубецкі, як сам пра сябе кажа, чалавек савецкі, які і выступае прадстаўніком савецкай улады: «І сад садзілі пад музыку, пад духавы аркестр, капалі ямкі, ставілі і прыкопвалі саджанцы, палівалі зямлю. І было бясконцае сонца, шмат чырвоных фарбаў, смеху і радасці» [3, с. 39]. Гэта ўтапічны вобраз савецкага грамадства, аднак такім чынам быў створаны свет, у які паверылі многія вяскоўцы, які знайшоў сваіх спадкаемцаў і абаронцаў, у прыватнасці, Мар’яна. Невыпадкова, што герой паходзіць з сям’і з моцнымі духоўнымі каранямі: яго дзед называе сябе родзічам зубра Сноўдалы, чакаць якога наказвае Мар’яну. У той жа час Знавец шануе не столькі крэўнае, а значыць, нацыянальна адметнае, колькі створанае савецкім ладам, дбае найперш пра агульнаграмадскі дабрабыт. Чарговае вынішчэнне саду падаецца як вялікі сацыяльны зрух. Ініцыятыўным выканаўцам выступае непрымірымы да савецкай улады Місцюк, які ўвасабляе карыслівасць, працавітасць, ён становіцца гаспадаром на зямлі, дзе раней рос сад, і ўдала багацее.

Цэнтральнымі ў аксіясферы рамана становяцца вобразы, што сімвалічна рэпрэзентуюць каштоўнасныя духоўныя ўніверсаліі, і вобразы, блізкія сацыяльным тыпам. З вёскай адбываюцца незваротныя працэсы, якія выяўляюць трагедыю ў нацыянальным маштабе. Маладое

пакаленне, якое нарадзілася і вырасла ў вёсцы, ад’язджае і не вяртаецца. Жыць і берагчы сваю зямлю застаецца хворы Уладзік, якога нават не ўзялі ў армію. Побач з ім знаходзяцца персанажы, што ўвасабляюць найперш сацыяльныя тыпы: Іванчык-дэзерцірчык, Вовік-алкаголік, Лукаш-страннік, дзед Калістрат, які ўзначальвае мясцовых баптыстаў. Чуйны да навакольнага свету Уладзік, духоўна блізкі Мар’яну, бачыць зубра Сноўдалу, які здольны бегчы з мінулага ў будучыню, размаўляць з дубам на вечныя тэмы: «У кожнага з нас, хто жыве на зямлі, у дрэў і звяроў, людзей, адзіны лёс. Упала дрэва – упаў і чалавек, на аднаго звера на зямлі стала меней, зрабіўся меншы на аднаго чалавека і свет» [3, с. 316]. У выніку пошук асобай уласнага лёсу ў нейкай меры прадвызначаны канкрэтна-гістарычнымі рэаліямі, якія залежаць ад чалавечага выбару, і аксіялагічнымі рэаліямі грамадства і нацыі, прыняцце якіх суадносіцца са стваральнай дзейнасцю, адмаўленне – з самаразбуральнай для асобы і свету.

**Літаратура**


1. Васючэнка, П.В. Віктар Казько / П.В. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Янкі Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск, 1999–2015. – Т. 4, кн. 1: 1966–1985. – 2002. – С. 729–749.
2. Друк, Г.М. Фальклорна-міфалагічныя матывы ў творчасці Віктара Казько: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.01.01 / Г.М. Друк; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2003. – 20 с.
3. Казько, В. Выбраныя творы: у 2 т. / В. Казько; прадм. Н. Ігруновай; маст. А.А. Бетанава. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 2 : Хроніка дзетдомаўскага саду: раман; Цвіце на Палессі груша: аповесць. – 480 с.
4. Яскевіч, А.С. Віктар Карамазаў / А.С. Яскевіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Янкі Купалы; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск, 1999–2015. – Т. 4, кн. 1: 1966–1985. – 2002. – С. 571–593.



**G.V. Novoseltseva**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: Novoseltseva.anna@mail.ru


## The Axiosphere of Romanov V. Karamazov and V. Kazko


*Key words: askiosphere, novel, hero, national character, value, Viktor Karamazov, Viktor Kazko.*



*In the article, using the example of the novels “Pushcha” by V. Karamazova, “Nerush”, “Chronicle of the orphanage garden” by V. Kazko, the artistic understanding of the continuity of the past, modern and future, careful attitude to nature and humanistic attitude to man is considered. The writers assert the importance of a person's mastering the ancestral heritage, belonging to the heritage of Belarusians, the moral character of a person seems to be the result of the determination of the spiritual experience of past generations.*